# Развважанні вакол аднаго магілёўскага дворыка

## Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала разабрацца, ад каго залежыць утульнасць нашых прыдамавых тэрыторый і чаму жыхары не задаволены дзеяннямі камунальнікаў

**Магілёўчанін Юрый Сязёмін лічыць сябе чалавекам неканфліктным, але тут, як той казаў, накіпела. Ён патэлефанаваў у карпункт, каб паведаміць, што ўжо роўна год знаходзіцца з родным ЖЭУ № 12 у стане перманентнай вайны. Мужчына прапанаваў на прыкладзе свайго дворыка паказаць, што перашкаджае жыхарам мірна суіснаваць з камунальнікамі. Пакуль мы здзяснялі з ім праменад па тым вельмі вялікім дворыку, да нас перыядычна падыходзілі людзі, каб падзякаваць Юрыю за прынцыповасць. Па іх словах, камунальныя праблемы звычайна пачынаюць вырашацца толькі тады, калі іх актывіст бярэцца за справу.**

### БЫЛО ДРЭВА — СТАЎ СЛУП

Ну вось я і на месцы — каля дома № 30 па бульвары Непакораных. Пакуль чакаю заяўніка, аглядаю тэрыторыю. На першы погляд, дастаткова ўтульна. Але з'яўляецца Юрый і пачынае «адкрываць» мне вочы. Першае, з чаго мы пачынаем агляд, — гэта дрэва. Дакладней, тое, што ад яго засталося. Калісьці яно, напэўна, было ўпрыгажэннем двара, але цяпер, прабачце, гэта слуп.


Навошта з дрэва зрабілі слуп?

— Дрэва абрэзалі летась восенню, і вясной на ім не з'явілася ніводнага лісточка, — кажа мой гід. — Бачыце, як пачарнела, хутчэй за ўсё, загіне. На ім нават грыбок вырас. Я напісаў скаргу наконт гэтага, а мне паведамілі, што ўсё нармальна. Маўляў, абрэзкай займаюцца кваліфікаваныя спецыялісты, і ўсё зроблена згодна з нарматывамі. Гэта, лічу, здзек. Прычым такіх дрэў я магу вам паказаць у нашым раёне каля дзясятка.

### СТРАСЦІ ВАКОЛ КАНТЭЙНЕРНАЙ ПЛЯЦОЎКІ

Непадалёк ад дрэва-слупа засталіся сляды нядаўняй кантэйнернай пляцоўкі.

— Па нарматыве пляцоўка для смецця павінна быць не бліжэй чым за 20 метраў ад дома, — здалёк пачынае Юрый Сямёнавіч. — Я замераў: ад майго дома № 30 да яе было 23 метры, ад суседняга № 32 — 25. Але пляцоўку ўсё роўна ліквідавалі. Цяпер ад дома да найбліжэйшага сметніка і назад мне трэба прайсці амаль паўкіламетра — 200 метраў у адзін бок і столькі ж у другі. Я лічу сябе здаровым чалавекам, але ў пад'ездзе жывуць людзі, якія не могуць спусціцца па лесвіцы, не тое што прайсці паўкіламетра, каб выкінуць свае адходы.

Шукаю вачыма, дзе тое месца, куды «пераехаў» сметнік, і не бачу. Юрый Сямёнавіч прапануе правесці. Сапраўды, не блізкі свет. Але дамы, здаецца, размешчаны яшчэ бліжэй, побач прадуктовая крама, за пару метраў ад бакаў стаіць машына. Але кантэйнеры заглыбленыя, і, як кажуць спецыялісты, там існуюць зусім іншыя нормы. Людзям з аддаленых дамоў хадзіць сюды сапраўды не вельмі зручна. Але іх абурае, што пляцоўку перанеслі без іх на тое згоды — проста паставілі перад фактам. Сапраўды, каму такое спадабаецца? Нядаўна ва ўсіх дзевяціпавярховіках былі смеццеправоды проста ў пад'ездах, а тут яшчэ трэба дайсці да таго кантэйнера. З крамы, што побач са сметнікам, выходзіць жанчына, і я прашу яе падзяліцца думкамі наконт кантэйнернай пляцоўкі.

— Гэта нейкае пакаранне, насіць смецце так далёка ад дома, — кажа яна. — А бывае, нешта тэрмінова трэба выкінуць, а спецыяльна бегчы на сметнік не па дарозе. Людзі пачынаюць выстаўляць усё гэта ў пад'езд на агульныя пляцоўкі. Пах — самі ўяўляеце. Але нас камунальнікі не чуюць.

### СЦЯЖЫНКА СПАТЫКАННЯ

Ад дома № 30 чорнай стужкай перасякае двор вузкая асфальтаваная сцяжынка. Вунь па ёй кудысьці пабег хлопчык, а насустрач яму павольна прайшлася маладая жанчына з каляскай. Яны, напэўна, не ведаюць, што гэты камфорт існуе тут таксама дзякуючы намаганням Юрыя Сязёміна.

— Гэта наша дарожка да крамы, — кажа ён. — Першапачаткова яна была выкладзена з вялікіх пліт, але летам іх прыбралі. Прыблізна ў той жа час пачалося будаўніцтва дарожкі ад школы ў наш бок, але там таксама замарозілі працэс. Як мне растлумачылі, працяг прадугледжаны планам добраўпарадкавання на наступны год. Паскарэнне работам надалі звароты актыўнага жыхара ў розныя інстанцыі, у тым ліку гарвыканкам і КДК. Адразу ж закіпела справа, і ўсе дарожкі былі зробленыя.

### ДЗЕ ГУЛЯЦЬ САБАКАМ?

Для Юрыя Сязёміна гэта зараз пытанне нумар адзін. Як ён сцвярджае, сабак выгульваюць нават на... школьным стадыёне. І, каб не быць галаслоўным, дэманструе фота. Вокны яго кватэры выходзяць менавіта на гэты самы стадыён, таму не давяраць словам Юрыя нельга. Камунальнікі вельмі своеасабліва прарэагавалі на нараканні жыльца. Якраз пад яго вокнамі я налічыла аж чатыры шыльдачкі, што выгул сабак забаронены. Пакуль іх разглядвала (а яны знаходзяцца дастаткова высока ад зямлі), падышла жанчына.

— Наш Сямёнавіч малайчына, — заўважыла яна. — З дарожкамі парадак навёў — хадзілі па


Сметнік пераехаў на аўтастаянку?

калена ў гразі, а цяпер стала цывілізавана. Я і сама часам указваю на нешта нашым майстрам, але толку мала. Ды і мяняюцца яны ў нас вельмі часта. З сабакамі таксама трэба нешта рабіць. Я не супраць таго, каб іх трымалі, але ж павінна быць дысцыпліна. За сваім любімцам трэба прыбіраць. Плюс адвесці спецыяльнае месца для іх выгулу.

### СПАКОЙ НАМ ТОЛЬКІ СНІЦЦА

— Я доўга маўчаў наконт такой работы камунальнікаў, а потым — як прарвала, — прызнаецца Юрый Сямёнавіч. — Напісаў у аблвыканкам, а мне адпіску далі на дзевяці старонках. Звярнуўся ў пракуратуру, і высветлілася, што ёсць парушэнні. Дзе логіка?

— І так ва ўсім, — бядуе суразмоўца і прыводзіць прыклад крыху ў іншую тэму. Рэч у тым, што ён трэнер па каратэ-до і займаецца са сваімі выхаванцамі на спартыўнай пляцоўцы, што ў парку 60 гадоў Кастрычніка. Пляцоўка была старая, яшчэ савецкіх часоў, але рабочая. Аднойчы спартсмены прыйшлі, а спартыўных снарадаў няма.

— Стаў шукаць канцы і трапіў на прыём да мэра, — кажа мужчына. — На ім прысутнічалі ўсе спецыялісты па маім пытанні. Сталі казаць пра тое, што гарадок знеслі ў мэтах бяспекі, маўляў, стары быў. І тады я ім паказаў фота з 10-сантыметровымі металічнымі «пянькамі», якія засталіся ад зрэзаных спартыўных снарадаў. Мэр загадаў вярнуць спартыўны гарадок. Яго вярнулі, але ўсё зрабілі па прынцыпе — адчапіцеся. А нядаўна зноў пачалі разбурыць тое, што аднавілі, і мне нічога іншага не застаецца, як зноў ісці па кабінетах.


Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь
ПРАКУРАТУРА г. Магілёва Магілёўскай вобласці

Генеральная прокуратура Республики Беларусь
ПРОКУРАТУРА г. Могилева Могилевской области

Сезёмину Юрию Семёновичу

бул.Непокоренных, д.30, кв.18,
212000, г.Могилев

Прокуратурой города Могилева рассмотрено Ваше обращение о допускаемых нарушениях законодательства об обращениях граждан и юридических лиц в ЖЭУ-12 КУП «ЖРЭУ Октябрьского района г.Могилева» (далее – ЖЭУ-12).

В целях всестороннего и полного рассмотрения обращения прокуратурой города Могилева проведена проверка соблюдения ЖЭУ-12 требований указанного законодательства, по результатам которой выявлены нарушения.

В связи с изложенным, прокуратурой города Могилева в адрес директора КУП «ЖРЭУ Октябрьского района г.Могилева» внесено представление об устранении нарушений законодательства с требованием привлечения виновных лиц к ответственности.

Заместитель прокурора города Могилева
советник юстиции Е.Г.Фурманов

Камунальнікі пішуць, што ўсё ліквідавана, а пракуратура знаходзіць парушэнні.

*P.S.*

*На жаль, вельмі часта погляды жыхароў і камунальнікаў на тое, як павінен выглядаць жылы двор або пад'езд дома, не супадаюць. Можна глядзець на гэта па-філасофску, як Амар Хаям. Памятаеце? «В одно окно смотрели двое. Один увидел дождь и грязь. Другой — листвы зеленой вязь, весну и небо голубое. В одно окно смотрели двое». Але ёсць і прынцыповыя пытанні. Мяне, напрыклад, абурыла, што ў пад'ездзе дома № 30 па бульвары Непакораных, дзе жыве Юрый Сязёмін, наогул адсутнічала святло. На ўваходзе было так цёмна, што я нават уключыла ліхтарык у сваім мабільніку. Мужчына растлумачыў, што на такія «дробязі» жыльцы, у тым ліку і ён, ужо наогул не звяртаюць ніякай увагі. Маўляў, прывыклі. Як на мяне ж, гэта недапрацоўка ЖЭУ, якое не клапоціцца пра бяспеку сваіх жыльцоў. Бо пра эканомію ў такіх пытаннях казаць проста некарэктна.*

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

### Каментарый у тэму

**Максім ЛІСОЎСКІ, намеснік дырэктара па добраўпарадкаванні Кастрычніцкага ЖРЭУ Магілёва:**

— Сёння фінансаванне абмежаванае, і добраўпарадкаваннем дворыкаў, а таксама ўстаноўкай там гульнявога абсталявання, мы займаемся разам з жыхарамі. Праводзім сходы і высвятляем, наколькі людзі гатовыя ўдзельнічаць у сафінансаванні. Ёсць вельмі добры прыклад па вуліцы Крупскай, 210, дзе жыхары сабралі грошы на абсталяванне. Перад гэтым яны выбралі старшага па доме, і ён займаўся зборам грошай. А ЖЭУ дапамагло жыхарам з набыццём і ўстаноўкай. Актыўныя жыхары — першыя нашы памочнікі. Дарэчы, у Юрыя Сязёміна ёсць усе даныя, каб стаць старшым па доме. Абавязкова прапануем яму гэтую грамадскую пасаду. Яго сігналы мы бяром на кантроль. У двары дома № 30 па бульвары Непакораных сапраўды ёсць дрэва, якое было абрэзана і засохла. Плануем вясной падчас суботніка з удзелам жыльцоў зрабіць кампенсацыйную пасадку. Што датычыцца кантэйнернай пляцоўкі, то мы яе толькі абслугоўваем. А рашэнне, дзе яна павінна быць, прымала Спецаўтапрадпрыемства. Там бяруць за аснову свае нарматывы. Напэўна, прадпрыемства палічыла перанос пляцоўкі ў іншы канец двара найбольш аптымальным рашэннем.

Што датычыцца стыхійнага выгулу сабак, то майстар там тройчы арганізоўвала рэйд, але безвынікова. Тым не менш калі такі факт будзе зафіксаваны, вiноўнікам на гэта абавязкова ўкажуць. Ёсць спецыяльна зацверджаныя адміністрацыяй раёна пляцоўкі для выгулу сабак. Найбліжэйшая ад бульвара Непакораных — гэта пустка паміж Спаса-Праабражэнскім храмам і аўтастаянкай па вуліцы Габраўскай.


### Извещение о проведении торгов по продаже предприятия как имущественного комплекса, созданного на базе ОАО «Рыбный ряд»

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | ЧУП «Антикризисная перспектива» (213809, г. Бобруйск, а/я 16, тел. +375293105283) |
| **Продавец** | ОАО «Рыбный ряд» (УНП 700067281) |
| **Форма, дата, время и место проведения торгов** | Торги в форме аукциона **15.01.2020 года в 12.00** по адресу: г. Бобруйск, ул. К. Маркса, 259 |
| **Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним** | Предприятие как имущественный комплекс с регистр. № 0001411 (созданном на базе ОАО «Рыбный ряд» (рыбоперерабатывающий цех). Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по тел. 8029 3105283 |
| **Начальная цена предмета торгов** | 230 400,00 бел. руб. без НДС |
| **Порядок проведения торгов** | Сумма шага аукциона – 5 % от начальной цены каждого лота. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее более высокую цену за предмет аукциона. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета торгов единственному участнику, подавшему заявку на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии осуществляется по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оформляются протоколом, который подписывается комиссией и победителем торгов в день проведения торгов. Договор купли-продажи подписывается в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 5 рабочих дней до наступления даты их проведения |
| **Размер, порядок и сроки внесения задатка** | Сумма задатка для участия в торгах – 10 % от начальной стоимости каждого лота. Для участия в торгах необходимо в срок с 31.12.2019 до 17.00 14.01.2020 перечислить задаток по предмету торгов по следующим реквизитам: ОАО «Рыбный ряд», УНП 700067281, р\с BY43BLBB30120700067281001001 в ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, БИК BLBBBY2X |
| **Место и сроки приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов** | Место и сроки приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов: заявление на участие принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 с 31.12.2019 до 17.00 14.01.2020. К заявлению прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юридических лиц – копия свидетельства о госрегистрации, устава; для ИП – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физических лиц – копия паспорта. Порядок приема заявлений на участие в торгах: заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по адресу: 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, К. Маркса, 254. Копия направляется на эл. адрес: fintrix@tut.by. Заявления, поступившие после 17.00 14.01.2020 года, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации. Заявления на участие в аукционе подаются по форме согласно приложению № 3 к приказу Министерства экономики Республики Беларусь от 29.11.2010 № 144. Участник аукциона и продавец (организатор торгов) заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по продаже имущественного комплекса (Приложение № 5 к Методическим рекомендациям). Отказ участников аукциона от участия в нем: участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором повторных торгов в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов производится победителем аукциона по фактическим затратам. В случае отказа или уклонения победителя аукциона от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, результаты аукциона подлежат аннулированию, а внесенный им задаток возврату не подлежит. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов |
| **Ранее опубликованные объявления** | Журнал «Судебный вестник плюс: экономическое правосудие» за 2019 год № 9 – стр. 64, № 11 – стр 61-62 |